# 9. ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ

## РАЗВИТИЕ КРИТИЧЕСКОГО МЫШЛЕНИЯ НА УРОКАХ ЧТЕНИЯ В НАЧАЛЬНОЙ ШКОЛЕ

**В.В. Алексейчик**

Научный руководитель: Т.И. Нестерович

Американский ученый Дэвид Клустер под критическим мышлением понимает «умение», которое помогает учащимся успешно справляться с трудностями учебного процесса. Этим определяется актуальность решения проблемы развития критического мышления средствами уроков чтения в начальной школе.

## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРША П. ПАНЧАНКІ «САРМАЦКАЕ КАДЗІЛА»

**Л.В. Васілеўская**

Навуковы кіраўнік: В.М. Шавель

Пімен Панчанка – адзін з буйнейшых беларускіх паэтаў ХХст., магчыма, самых няўрымслівых і неспакойных. Яго творчасць адзначана асабліва гарачымі шуканнямі, ненатольнымі эмоцыямі і страсцямі. Пра Панчанку смела можна сказаць, што ён сын сваёй эпохі. Вядомы крытык Р. Шкраба на гэты конт заўважыў вельмі дакладна: «П. Панчанка піша толькі пра тое, што ўскалыхнула яго самога, прымусіла мацней біцца сэрца, вывела з раўнавагі. Неабыякавасць, пачуццё асабістай зацікаўленасці, імкненне давесці свой погляд, падзяліцца самым патаемным з другім чалавекам – у гэтым ёсць адзнака сапраўднай паэзіі:

Я вершы пішу, бо душа ўстрывожана
Любоўю і болем за кожнага з вас».

Адной з такіх тэм, якая ўсхвалявала душу паэта, з'яўляецца тэма прыроды. Ён не застаецца абыякавым да роднай зямлі, яе стану, выражае сваю заклапочанасць узаемаадносінамі чалавека і прыроды, раскрывае згубнасць павярхоўна-спажывецкага станаўлення да навакольнага асяроддзя і яго багаццяў. І гэта невыпадкова. З біяграфіі Панчанкі вядома, што яго дзяцінства прайшло на мілай сэрцу Бягомльшчыне, на лясным улонні.

«Мяне заўсёды здзіўляла, – піша паэт у эсэ "Пра сябе", – якія ў нас разнастайныя, непаўторныя лясы: магутныя пушчы, заўсёды ўсхваляваныя асіннікі, звонкія высокія бары, прасторныя дубровы, вясёлыя бярозавыя гаі, застыўшыя ў непрыступных калонах ельнікі, калінавыя і чаромхавыя зараснікі... . Для беларускіх хлапчукоў лес – першая школа, зялёная энцыклапедыя».

Так мог сказаць пра лясныя масівы толькі той чалавек, які па-сапраўднаму любіць, цэніць прыроду і з замілаваннем адносіцца да яе.

Калі звяртаем увагу на год напісання верша «Сармацкае кадзіла», становіцца зразумелай яшчэ адна прычына звароту да гэтай тэмы.

1986... Лічба, якая надоўга застанецца ў памяці беларускага народа. Як незагойная рана яна заўжды будзе нагадваць чалавеку аб тых жудасных падзеях, якія адбыліся 26 красавіка 1986 г., – выбух на Чарнобыльскай АЭС. Чарнобыльская трагедыя – гэта боль, смутак, крык чалавечай душы, плач, выміранне. А яшчэ гэта пакаранне за нашы недарэчныя ўчынкі, безгаспадарчыя адносіны да навакольнага асяроддзя. Там, дзе народ не гаспадар сваёй зямлі, дзе няма нацыянальнага ўсведамлення, лёгка адбыцца непапраўнай бядзе. Менавіта гэтую думку хацеў данесці да нас, нашчадкаў, паэт. Ён падкрэсліў у вершы, што ў вынішчэнні прыгажосці «вінаваты ўсе мы: ты і я». І як напамін уводзіць назвы тых кветак, якія занесены ў Чырвоную кнігу і знаходзяцца пад пагрозай вынішчэння: кураслеп лясны, ворлік, сон-трава, меч-трава, пазнацвет, венерын чаравічок, сіні званочак і інш., якія ўжо адной назвай прыцягваюць увагу да сябе.

Сіні званочак – прыгажун нашых лясоў – мае класічную форму, нібы адліты са звонкага металу, рассечаныя на пяць пялёсткаў венчыкі звісаюць на тонкіх ножках, у сярэдзіне – нектарная залозка; знешне вельмі прыгожы і безабаронны, падобны на званочак, таму і атрымаў такую назву. Гэтыя кветкі – адны з самых любімых у народзе, пра што сведчаць дакладныя і ласкавыя назвы, якімі людзі надзялілі расліну: званцы, чабаткі, галубкі і інш. Але ўсё менш і менш застаецца гэтых званочкаў у нашых лясах: яны пакутуюць з-за сваёй прывабнасці і непаўторнасці.

Назва «сон-трава» звязана з паданнем пра тое, як жывёлы і людзі, пакаштаваўшы корань расліны, упадалі ў глыбокі сон. І гэта невыпадкова, бо хоць знешне кветка надзвычай прыгожая і адной з першых з'яўляецца вясной на лясных праталінах, але ж яна ўся атрутная.

Усе вельмі добра ведаюць, мабыць, такую расліну, як кураслеп, і не аднойчы сустракаліся з ёй. Назва гаворыць сама за сябе. Але, калі перакласці яе на рускую мову – «ветреница», раскрываецца яшчэ адна яе якасць. Справа ў тым, што цвіценне гэтай кветкі супадае з перыядам вятроў. На адкрытых схілах, нават пры найменшым подыху ветру, кветкі кураслепу на доўгіх кветканожках пачынаюць рух, нібы белыя матылькі махаюць крыламі, але ўзляцець не могуць. У канцы цвіцення, асабліва ў гарачае сухое надвор'е, вецер завяршае парад прыгажосці: ён паскарае завяданне пялёсткаў або зрывае іх зусім.

Беларуская назва расліны меч-трава дадзена з-за лісця, якое завострана па краях і мае падабенства з мячом. Лацінская назва «кладзіум», што ў перакладзе азначае «галінка», звязана, мабыць, з вельмі галіністай верхняй часткай расліны. А сярод сваіх бліжэйшых сародзічаў – асаковых – меч-трава і сапраўды выглядае пагрозліва: магутная карнявая сістэма, ад якой адыходзіць моцнае вертыкальнае акруглае сцябло, лінейнае лісце даўжынёй да аднаго метра, завостранае на канцы, якім не так доўга і парэзацца. Чым не меч?

Дакладнага тлумачэння патрабуе назва такой расліны, як сармацкае кадзіла. Ні адна літаратурная крыніца не дала адказу на гэтае пытанне. Калі звярнуцца да энцыклапедыі, то чытаем, што кадзіла – металічная пасудзіна на ланцужках, у якой у час набажэнства курыцца ладан або іншыя пахучыя рэчывы; сарматы – адгалінаванне качавых жывёлагадоўчых іранамоўных плямён, якія ў VIIIст. н.э. асіміляваліся са славянскімі народамі.

Кадзіла сармацкае – рэдкі від, які знаходзіцца пад пагрозай вынішчэння. Меданосная, дэкаратыўная і лекавая расліна, якая шырока выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне. Для захавання віду неабходна надзейная ахова месцаў, дзе яна расце.

Пры гэтым усе расліны і іншыя аб'екты прыроды надзелены чалавечымі якасцямі. У вершы П. Панчанкі «сармацкае кадзіла» мы можам выдзеліць наступныя метафары: кветкі збеглі, жылы лесу, зялёная радня, зямля будзе цярпець, лета захлынулася ў расе. П. Панчанка называе кветкі «жыламі лесу», гэта знаьщь той крыніцай, якая жывіць лес, робіць яго больш разнастайным і прыгожым.

Не так ужо многа і эпітэтаў. Мабыць, аўтар палічыў непатрэбным дадаць яркасці ў апісанні кветак, бо яны самі гавораць за сябе. Пры вымаўленні адной толькі назвы перад намі паўстаюць непаўторныя і яркія краскі. Пры гэтым кожная кветка з'яўляецца своеасаблівай і індывідуальнай. Вось, напрыклад, як аўтар адзначае асаблівасць мяты звычайнай: «сцюдзёны водар мяты...». Ён не сказаў прыемны, халаднаваты, а менавіта «сцюдзёны» – вось так дакладна характарызуючы своеасаблівы пах гэтай расліны.

У апошнім радку пры апісанні сіняга званочка паэт, каб перадаць звон і дрыготкае хістанне гэтай кветачкі, выкарыстоўвае паўтор гукаў [с], [з], [с'], [з'] («І званочак сіні ў лесе рос»).

Але гаворка заходзіць аб выніках «жалезнага прагрэсу», перад намі паўстаюць тыя машыны і трактары, якія сваім гучаннем, нібы гром з неба, нагадваюць аб грукаце гэтай цяжкай тэхнікі.

Душна ад жалезнага прагрэсу:
Дружна падразаем жылы лесу,
Траў і кветак топчам карані,
Ад зялёнай адракаемся радні.

У тэксце пераважаюць сказы з пытальнай інтанацыяй, нібы аўтар шукае адказ: дзе падзеліся расліны, чорны бусел, іншыя жывёлы, дакуль зямля будзе цярпець, чым жа дыхаць, чыя ў гэтым віна? Аўтар прапануе чытачу свой варыянт адказу: «Вінаваты ўсе мы: ты і я». Слова «вінаваты» выкарыстоўваецца двойчы, каб паказаць скандэнсаванасць пачуцця.

Верш П. Панчанкі «Сармацкае кадзіла» – гэта своеасаблівы зварот-просьба да людзей, каб яны змянілі свае спажывецкія адносіны да прыроды, ўспомнілі, што не адзіныя на гэтай планеце, таму павінны клапаціцца аб будучых пакаленнях нашчадкаў.